Вольга Сабалеўская

# Падведзены вынікі першага рэспубліканскага конкурсу навуковых работ

Напрыканцы мінулага года падведзены вынікі першага ў гісторыі айчыннай бібліятэчнай справы конкурсу навуковых работ па бібліятэказнаўству, бібліяграфіі і кнігазнаўству. Арганізаваны з мэтай актывізацыі рэфармавання і далейшага развіцця бібліятэчнай справы ў рэспубліцы, стымулявання творчых здольнасцей высокакваліфікаваных спецыялістаў конкурс даў магчымасць высветліць кола праблем, якія з'яўляюцца сёння прадметам навуковых распрацовак у бібліятэчных калектывах, раскрыў патэнцыял бібліятэчных работнікаў і іх імкненне да навуковай работы. На конкурс было прадстаўлена 20 работ як асобных аўтараў, так і навуковых калектываў. Сярод дасланых матэрыялаў – навуковыя зборнікі, метадычныя і бібліяграфічныя працы, аналітычныя матэрыялы па выніках даследаванняў, вучэбныя дапаможнікі, бібліятэчныя мемуары, тлумачальны слоўнік па бібліятэчнай тэрміналогіі і адукацыйны стандарт. Станоўчым з'яўляецца ўдзел у конкурсе супрацоўнікаў раённых і гарадскіх публічных бібліятэк, аднак рэспубліканскія галіновыя бібліятэкі, на жаль, не праявілі цікавасці да яго.

Дэталёвае вывучэнне прадстаўленых работ праводзілася не толькі членамі кампетэнтнага журы, але і экспертамі, чые адзнакі былі ўлічаны пры ўнясенні прапаноў па кандыдатурах на прызавыя месцы. На заключным пасяджэнні журы, якое адбылося 20 жніўня 2002 г., было вырашана прысудзіць **Першую грашовую прэмію (200 тыс. руб.)** калектыву складальнікаў зборніка «Бібліятэчная справа на Беларусі: Дакументы і матэрыялы. 1959–1975» (Мінск, НББ, 2000) і калектыву складальнікаў «Тлумачальнага слоўніка бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў» (Мінск, БДУК, 2000). **Другую грашовую прэмію (100 тыс. руб.)** – аўтару кнігі мемуараў «Библиотечные тайны» (Мінск, БДУ, 2001) Арэхоўскай І.В., складальнікам зводнага каталога «Дореволюционные издания А.С. Пушкина и литература о нем из фондов библиотек, музеев и архивов Беларуси» (Мінск, Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна, 2000), аўтару аналітычных матэрыялаў па выніках сацыялагічнага даследавання «Роль библиотеки в удовлетворении информационных потребностей учителей системы среднего образования» (Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна, 2001) Гонаравай Л.К. **Трэцюю грашовую прэмію (60 тыс. руб)** – распрацоўшчыкам адукацыйнага стандарта «Сярэдняя спецыяльная адукацыя. Спецыяльнасць 23.01.10 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» Платоненка Л.Ф., Зайчанка Т.Б. (Магілёў, Магілёўскі дзяржаўны бібліятэчны тэхнікум імя А.С. Пушкіна, 2001), аўтарам калектыўнай працы «Метадычныя работы і аналітычныя даследаванні аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦБС г. Баранавічы» (Баранавічская ГЦБС, 2001), аўтару работы «Деловые игры – активный метод обучения библиотечных кадров» Максіменку Ю.І. (Гомель, Гомельская абласная універсальная бібліятэка імя У.І. Леніна, 2001), складальнікам біябібліяграфічнага даведніка «Выпускнікі і навучэнцы Магілёўскай мужчынскай гімназіі. 1809–1999» (Магілёў, Магілёўская аб'яднаная абласная бібліятэка імя У.І. Леніна, Магілёўскі дзяржаўны бібліятэчны тэхнікум імя А.С. Пушкіна, 1999), Гурковіч Л.Я. і Украінка З.М., складальнікам зборніка «Нарысы гісторыі бібліятэк Брэсцкай вобласці» (Брэст, Брэсцкая абласная бібліятэка імя А.М. Горкага, 2001) Рачкоўскай Л.І. і Мяснянкінай Д.М.

Журы падкрэсліла значнасць праведзенага мерапрыемства і падтрымала прапанову прэзідэнта ББА Лапо П.М. праводзіць такі конкурс раз у тры гады, так як гэта будзе стымуляваць павышэнне прафесійнага ўзроўню бібліятэкараў і развіццё айчыннай бібліятэчнай навукі. П.М. Лапо выказаў надзею, што наступны конкурс будзе мець больш масавы характар і ў ім прымуць удзел бібліятэкі ўсіх сістэм і ведамстваў.

Спадзяемся, што сціпласць нашых навукоўцаў не стане перашкодай для прадстаўлення іх работ на чарговае навуковае спаборніцтва.

Афіцыйныя матэрыялы па выніках конкурсу прадстаўлены на сайце ББА.